Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Кароцькаўская сярэдняя школа Кармянскага раёна імя П.П. Качуеўскага»

Апісанне вопыту педагагічнай дзейнасці

# «ВІЗУАЛІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК СРОДАК АКТЫВІЗАЦЫІ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ»

Дзямідава Таццяна Віктараўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
8(029)1083210;
e-mail: basium_tatyana@mail.ru

## 1. Інфармацыйны блок

### 1.1 Назва тэмы вопыту

Візуалізацыя вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы як сродак актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў

### 1.2 Актуальнасць вопыту

На сённяшні дзень актуальнай становіцца праблема, звязаная з падрыхтоўкай вучняў да самастойнага жыцця. У гэтым напрамку галоўнай задачай настаўніка з'яўляецца арганізацыя самастойнай дзейнасці вучняў, што дапаможа рэалізаваць кожнаму свае здольнасці. Па-гэтаму прадстаўлены вопыт накіраваны на стварэнне ўмоў для самарэалізацыі вучняў з розным узроўнем здольнасцей праз выкарыстанне сродкаў візуалізацыі на ўроках беларускай мовы.

Прыёмы візуалізацыі дапамагаюць падтрымліваць пазнавальную дзейнасць, развіваюць мысленне высокага ўзроўню.

Метадычна правільны падыход да візуалізацыі садзейнічае пераходу вучня на больш высокі ўзровень пазнавальнай дзейнасці, стымулюе крэатыўны падыход, вучыць самастойна рашаць пастаўленыя задачы.

### 1.3 Мэта вопыту

Мэта: адлюстраванне спецыфікі выкарыстання прыёмаў візуалізацыі вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы як сродак актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў.

### 1.4 Задачы вопыту:

раскрыць змест прыёмаў візуалізацыі, якія забяспечваюць дастатковы ўзровень падрыхтоўкі вучняў па беларускай мове;

апрабіраваць розныя прыёмы візуалізацыі вучэбнага матэрыялу;

вызначыць эфектыўнасць выкарыстання розных прыёмаў візуалізацыі на ўроках як сродак актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў.

### 1.5 Працягласць работы над вопытам

Вопыт фарміраваўся на працягу чатырох гадоў.

I этап – аналізавала тэарэтычную і практычную базу прыёмаў візуалізацыі, якія паспяхова выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы, звярталася да навукова-метадычнай літаратуры па выбранай праблеме, вывучала рэкамендацыі;

II этап – зрабіла адбор і апрабіравала розныя прыёмы візуалізацыі, выбірала найбольш падыходзячыя для сябе і сваіх вучняў, займалася пошукам новых прыёмаў, прымяняла іх на практыцы;

III этап – правяла параўнальны аналіз узроўню падрыхтоўкі вучняў па беларускай мове.

## 2. Апісанне тэхналогіі вопыту

### 2.1 Вядучая ідэя вопыту

Для таго, каб садзейнічаць пераходу вучняў на больш высокі ўзровень пазнавальнай дзейнасці, арганізоўваць самастойную дзейнасць вучняў, адказваць патрэбам сучаснага развіцця камп'ютарных тэхналогій з мэтай рашэння дадзенага пытання вызначана вядучая ідэя маёй педагагічнай дзейнасці – прымяненне сродкаў візуалізацыя вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы як сродку актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў.

### 2.2 Апісанне сутнасці вопыту

Развіццё інфарматызацыі ў грамадстве прывяло да пэўных змен у разнастайных сферах дзейнасці чалавека. Дзеці, якія выраслі ў эпоху высокіх тэхналогій, зусім па-іншаму глядзяць на свет. Яны ўспрымаюць інфармацыю не паслядоўна і не тэкстава, а бачаць малюнак у цэлым і ўспрымаюць інфармацыю па прынцыпу кліпа. Тут мы сутыкаемся з такім тыпам мыслення, як кліпавым.

Бясспрэчна, у адказ на выклік сучаснага інфармацыйнага свету патрабуюць актуалізацыі традыцыйныя падыходы адукацыі. Выкарыстанне на ўроках разнастайных прыёмаў і сродкаў візуалізацыі будзе спрыяць эфектыўнасці падачы матэрыялу, таму што дазваляе максімальна задзейнічаць розныя каналы ўспрымання інфармацыі вучняў.

На ўроках візуалізацыя дазваляе вобразна прадставіць інфармацыю. Аднак дэманстрацыя павінна быць узаемазвязана паміж тэкстам і яго графічнымі

адпаведнікамі. Выкарыстанне спосабаў візуалізацыі на розных этапах вывучэння мовы паляпшае засваенне вучэбнага матэрыялу. «Развіццё ніколі не можа быць дасягнута шляхам прымусу, яно мае месца толькі тады, калі чалавек сам цягнецца да ведаў, да творчасці» [1, с. 3]. Неабходна ўлічваць уплыў выклікаў, звязаных з распаўсюджваннем лічбавых тэхналогій. Гэты працэс «істотна змяніў спосабы камунікацыі і сацыякультурную прастору (папулярнасць сацыяльнага дыстанцыравання, заглыбленасць вучняў у віртуальную прастору, рэзкае змяншэнне «жывых» зносін, змяншэнне эфектыўнасці педагагічнага ўздзеяння)» [2, с. 124].

У сваёй педагагічнай дзейнасці падбіраю прыёмы візуалізацыі з улікам канкрэтных вучэбных задач, выкарыстоўваючы розныя спосабы візуалізацыі на любых з этапаў урока: пры вывучэнні новага матэрыялу, пры замацаванні, пры паўтарэнні і інш.

«Асноўнай мэтай візуалізацыі з’яўляецца выкарыстанне зрокавага ўспрымання чалавекам інфармацыі для актывізацыі яго пазнавальнай дзейнасці, развіцця крытычнага мыслення і крэатыўнасці. Уменне візуалізаваць вучэбную інфармацыю з’яўляецца адной з неабходных якасцей настаўніка. Дыдактычная значнасць працэсаў візуалізацыі праяўляецца перш за ўсё ва ўвасабленні прынцыпу нагляднасці ў навучанні. Аднак сучасныя ўмовы патрабуюць яго рэалізацыі на якасна новым узроўні: варта не проста выкарыстоўваць візуальныя сродкі для ілюстрацыі вучэбнага матэрыялу, а садзейнічаць актывізацыі разумовай і пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў» [3]. Сярод традыцыйных спосабаў візуалізацыі выкарыстоўваю схемы, табліцы, крыжаванкі, апорныя канспекты, прэзентацыі. Напрыклад:

| **Прыкметы словазлучэнняў** | **Прыкметы фразеалагізмаў** |
|---|---|
| Кожнае слова захоўвае сваё лексічнае значэнне. | Словы страчваюць сваю сэнсавую самастойнасць, маюць адзіны сэнс. |
| Любое са слоў можна замяніць іншымі словамі. | У іх складзе нельга замяняць адно слова іншым. |
| Ствараюцца ў працэсе маўлення, не патрабуюць запамінання. | Выкарыстоўваюцца як гатовыя, вядомыя спалучэнні. |

| | |
|---|---|
| Кожнае слова выступае ў ролі пэўнага члена сказа. | Выступаюць у ролі аднаго члена сказа. |
| Да словазлучэнняў нельга падабраць сінонімы і антонімы. | Да фразеалагізмаў можна падабраць сінонімы, антонімы. |




| Слова | Лексічнае значэнне | Граматычнае значэнне |
|---|---|---|
| Абсурд | Недарэчнасць, бязглуздзіца, лухта | *(што?)* Назоўнік мужчынскага роду, у адз. ліку, назоўным склоне |
| Адвечны | | *(які?)* Прыметнік у форме мужчынскага роду, адз. ліку, назоўнага склону |
| Нясу | Перамяшчаю разам з сабою | |
| | Перамяшчу разам з сабою | *(што зраблю?)* Дзеяслоў у форме будучага часу, 1-й асобы, адз. ліку |

Прэзентацыю выкарыстоўваю найчасцей адным з трох спосабаў:

як урок-прэзентацыя (калі ўся інфармацыя падаецца толькі на экране);

урок з праглядам прэзентацыі (частковы зварот да экрана на любым з этапаў урока);

прэзентацыя, зробленая вучнем ці калектыўна (найчасцей выкарыстоўваю як сродак праверкі засваення пройдзенага матэрыялу). Напрыклад, на слайдзе размяшчаюцца малюнкі, вучням трэба вызначыць, якім фразеалагізмам яны адпавядаюць, скласці і запісаць сказы:

1



2



3



4



5



6



7



8



З развіццём камп’ютарных тэхналогій узнікае патрэба і магчымасць у выкарыстанні і распрацоўцы новых спосабаў візуалізацыі (воблака слоў, інфраграфіка, калаж, кросэнс, скрайбінг і інш.).

Воблака слоў – гэта візуальнае ўяўленне групы слоў, аб’яднаных пэўнай тэматыкай. Іх выкарыстанне магчыма ў якасці дыдактычнага матэрыялу на ўроках (раздрукаваных ці ў электронным выглядзе) ці для акцэнта на ключавых момантах або пры ацэньванні пэўных тэм.






Воблакі слоў можна знайсці ў гатовым выглядзе ці зрабіць самому. Па жаданні можна прапанаваць вучням распрацаваць самастойна ці ў калектыўнай працы. Стварыць такое воблака слоў можна пры дапамозе рэсурса WordsCloud.

Вельмі часта выкарыстоўваю воблака слоў сумесна з іншымі прыёмамі візуалізацыі. Напрыклад, прапаноўваю вучням разгадаць крыжаванку, а ў якасці дапаможнага матэрыялу прыкладаю воблака слоў, у якім размешчаны словы-адказы:







**Па вертыкалі:** 1. Аўсяны кісель.
2. З аладкамі, дранікамі, бабкай…
4. 
6. Свежыя, сушоныя, салёныя.
7. Рэдкая мучная каша з салам.
10. 
12. Ежа ў час пастоў.

**Па гарызанталі:** 3. Тварожны…
5. Запечаная каша з проса.
8. 
9. Каша з мукі і соладу.
11. 
13. Мучная страва з мясам, каўбасамі і прыправамі.
14. Квашаная…

Яшчэ адзін спосаб візуалізацыі – гэта кросэнс ці асацыятыўны ланцужок, замкнуты ў полі з дзевяці квадратаў, у якіх змешчаны карцінкі па тэме. Кожная выява звязана з наступнай і папярэдняй па сэнсе. Настаўнік будуе абмен думкамі на ўроку па прапанаваных выявах, а вучні тлумачаць, што абазначаюць малюнкі і чым яны ўзаемазвязаны. «Кросэнс – метадычны прыём, які дазваляе на практыцы ўвасобіць у дзейнасці настаўніка змену прыярытэтаў, прадыктаваных

мэтамі сучаснай адукацыі – стварыць умовы для самастойнага творчага пошуку вучня» [4]:




Для запамінання вучнямі вялікіх аб’ёмаў інфармацыі выкарыстоўваю інтэлект-карты ці карты памяці, асацыятыўныя карты. Гэта графічны спосаб прадставіць канцэпцыі, ідэі, інфармацыю ў выглядзе карты, якая складаецца з ключавых тэм і другасных.

Інфраграфіка дазваляе ў змястоўнай, лёгкай да ўспрыняцця і алегарычнай форме данесці пэўны матэрыял. Для стварэння інфраграфікі выкарыстоўваюцца табліцы, нейкія графічныя элементы, дыяграмы.

Адным са спосабаў працы з візуалізацыяй з’яўляецца прымяненне QR-кодаў, якія надаюць вучэбнаму матэрыялу новую арганізацыйную форму, цікавую тым, што для раскадзіроўкі неабходна прымяніць смартфон. QR-коды размяшчаюцца у дыдактычным матэрыяле, выкарыстоўваюцца як элемент прэзентацыі.

Некаторыя прыёмы візуалізацыі, якімі я карыстаюся на ўроках беларускай мовы, нясуць з сабой гульнёвыя мэты. Яны маюць дачыненне да тэмы ўрока ці звязаны са зместам твора, але найбольш накіраваны на аналіз слоў, назваў, якія сустракаюцца ў творы. Напрыклад, калі ў вывучаемым творы сустракаюцца назвы адзення, я даю заданне перакласці з рускай мовы на беларускую

прапанаваныя назвы, да якіх прыкладаю ілюстрацыі, дзялю вучняў на пары ці каманды:

| | | |
|---|---|---|
| |  | носки |
| |  | шуба |
| |  | рубашка |
| |  | перчатки |
| |  | жилетка |
| |  | чулки |
| |  | платье |
| |  | платок |
| |  | юбка |

Адной з любімых гульняў вучняў з’яўляецца «Трыміно» – гэта трохвугольнікі, якія трэба скласці так, каб стораны суадносіліся паміж сабой:







## 2.1 Выніковасць і эфектыўнасць вопыту

Рэзультатыўнасць вопыту пацвярджаецца дасягненнямі вучняў. Гэта, па-першае, павышэнне ведаў школьнікаў, што спрыяе атрыманню імі больш высокіх адзнак. Звернем увагу на дыяграму:




Па-другое, удзел у конкурсах, алімпіядах, атрыманне перамог на раённых і абласных этапах: 2020г. – дыплом II ступені на раённым этапе абласнога конкурса відэаработ «Стань букцьюберам – раскажы аб прачытанай кнізе» (вучаніца 7 кл.); 2021г. – дыплом I ступені на раённым этапе і I ступені на абласным этапе конкурса буктрэйлераў «Пад небам сінім» (вучаніца 9 кл.); 2022г. – дыплом I ступені на раённым этапе і III на занальным этапе конкурса «Хачу быць педагогам» у намінацыі буктрэйлер (вучань 9 кл.).

Па-трэцяе, перамогі на алімпіядах: 2024г., 2025г., 2026г. – дыпломы I і II ступені раённага этапу рэспубліканскай алімпіяды па «Беларускай мове» і «Беларускай літаратуры».

## 3. Заключэнне

Жаданне кожнага настаўніка – дасягненне станоўчых вынікаў у адукацыйным працэсе, дапамагчы кожнаму вучню знайсці сябе, сваё прызванне, свой шлях, зрабіць усё магчымае, каб вучні раскрывалі свае здольнасці, праяўлялі творчасць, каб максімальна рэалізавалі сябе ў будучым. Візуалізацыя вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы – неабходны сродак актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў. Прыёмы візуалізацыі з’яўляюцца ўніверсальнымі – гэта значыць іх можна выкарыстоўваць пры вывучэнні розных тэм, на любым з этапаў урока.

Пры дапамозе інфармацыйных тэхналогій фарміруюцца ў вучняў уменні самастойна шукаць, аналізаваць і адбіраць неабходную інфармацыю, пераўтвараць, захоўваць і перадаваць яе. Прымяненне традыцыйных і сучасных

спосабаў візуалізацыі дазваляе выпрацоўваць уменне аналізу, абагульнення аб'ёмнай інфармацыі і пасяховае прымяненне яе на практыцы.

«Сродкі візуалізацыі матэрыялу знаёмяць вучняў з прыёмамі работы з інфармацыяй: здабываць, аналізаваць, сістэматызаваць, рабіць высновы. Прымяненне візуалізацыі на ўроках дазваляе апрацаваць большую колькасць інфармацыі і арганізаваць дзейнасць вучняў з улікам іх індывідуальных асаблівасцей, павысіць цікавасць да вучэбнага прадмета і ўзровень навучанасці дзяцей» [5].

Абагульнены вопыт распаўсюджваецца мною як сярод педагогаў Кармянскага раёна (на метадычных пасяджэннях, у якасці правядзення майстар-класаў: «Роля візуалізацыі ў забеспячэнні дасягнення вучнямі асобасных метапрадметных і прадметных вынікаў навучання», «Асаблівасці выкарыстання розных відаў і тыпаў візуалізацыі вучэбнай інфармацыі на ўроках беларускай мовы і літартуры»), так і Гомельскай вобласці (падчас правядзення практычных заняткаў на павышэнне кваліфікацыі ў красавіку 15.04.2024 на аўтарскіх курсах Даўгулёвай Ірыны Аляксееўны па тэме: «Педагагічная майстэрня «Тэхналогія візуалізацыі як спосаб развіцця вучэбна-пазнавальных кампетэнцый вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры». «Рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу на вучэбных занятках па беларускай мове і літаратуры». «Павышэнне педагагічнай дзейнасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры па фарміраванні фінансавай граматнасці навучэнцаў»).

Такім чынам, праз выкарыстанне сучасных спосабаў візуалізацыі на ўроках беларускай мовы ствараюцца спрыяльныя ўмовы для развіцця крытычнага мыслення, развіваюцца навыкі працы з інфармацыяй. Прапанаваны вопыт не дае магчымасці лічыць атрыманыя веды канчатковымі, але распрацаваная сістэма мае перспектыву развіцця. Прадстаўлены мною практычны матэрыял можа выкарыстоўвацца настаўнікамі беларускай мовы на розных этапах урока як сродак актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, пры падрыхтоўцы да ЦЭ і ЦТ, удзелу ў алімпіядах па прадмеце. А якасныя паказчыкі вопыту сведчаць аб неабходнасці працягваць работу ў дадзеным накірунку.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Жуковіч М. В. Фарміраванне ў школьнікаў матывацыі да навучання на ўраках беларускай мовы і літаратуры. / Беларуская мова і літаратура – 2004. – №6, – с. 3 – 5

2. Короткевич, В. И. Формирование и развитие эмоционального и духовного интеллекта учащихся средствами литературной педагогики / В. И. Короткевич // Литературная педагогика и читательская грамотность: новые форматы и практики: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Казань, 26 окт. 2022 г. – Казань: Казан. ун-т, 2022. – С. 124–127.

3. Карабкова, Н. І. Візуалізацыя на ўроках беларускай літаратуры / Н. І. Карабкова. – URL: https://nastgaz.by/vizualizatsyya-na-urokah-belaruskaj-litaratury/?ysclid=lst8adbznh440610625 (дата звароту: 25.02.2026).

4. Харлап, Г. Л. Візуалізацыя вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы і літаратуры (інтэлект-карты, воблака слоў, калаж) як спосаб развіцця інфармацыйных кампетэнцый вучняў / Г. Л. Харлап. – URL: Візуалізацыя вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы і літаратуры (інтэлект-карты, воблака слоў, калаж і інш.) як спосаб развіцця інфармацыйных кампетэнцый вучняў (infourok.ru) (дата звароту: 19.02.2026).

5. Дзядкоўская, І. В. Чым карысныя сродкі візуалізацыі, і як іх прымяняць на ўроках беларускай мовы / І. В. Дзядкоўская. – URL: https://narasveta.by (дата звароту: 25.02.2026).

**Дадатак 2**

**Урок беларускай мовы ў 6 класе**

**Тэма:** Спосабы ўтварэння назоўнікаў

**Мэта** актуалізацыя ведаў вучняў пра асноўныя спосабы ўтварэння назоўнікаў (суфіксальны, прыставачны, прыставачна-суфіксальны, складанне (асноваскладанне, складана-суфіксальны, словаскладанне), абрэвіяцыю)

**Задачы:** развіваць уменні вызначаць спосаб утварэння назоўнікаў (у тым ліку бяссуфіксны ці нульсуфіксальны), абазначаць сродкі ўтварэння; фарміраваць камунікатыўна-маўленчыя ўменні; абудзіць цікавасць, павагу да роднага слова, працэсу пазнання, імкненне вывучаць не толькі родную літаратуру, а і літаратуру іншых народаў

**Тып урока:** камбінаваны

**Форма ўрока:** урок-прэзентацыя

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / *Г.М. Валочка, В.У. Зелянко, С.В. Мартынкевіч.* – Мінск, 2020; мульціборд; карткі з заданнямі

## Ход урока

**1. Матывацыйна-арганізацыйны этап**

Арганізацыйна-псіхалагічная падрыхтоўка вучняў да працы:

*Дарагія сябры! Я ведаю, што сярод вас няма нікога, хто б не любіў родную мову. Я не памыляюся? Вельмі рада, што вы з задавальненнем прыйшлі на ўрок, дзе…*



Слайд 1

*Куды нас запрашае родная мова? (У казку.) Хочаце адправіцца? Падыміце рукі, хто хоча адправіцца? А хто вельмі-вельмі хоча, папляскайце ў далоні!*

Аб'яўленне тэмы ўрока, пастаноўка мэты і вучэбных задач:

Тэма: Спосабы ўтварэння назоўнікаў

Мэту і задачы вучні вызначаюць самі:

1) Мы павінны даведацца… (пры дапамозе чаго і якімі спосабамі ўтвараюцца назоўнікі)

2) Развіваць уменні… (знаходзіць назоўнікі ў тэксце, вызначаць спосабы ўтварэння назоўнікаў)
3) Знайсці адказы на… (праблемныя пытанні і інш).

Матывацыя вучэбнай дзейнасці:


Слайд 2

*Сёння мы адправімся ў краіну казак вядомага французскага казачніка Шарля Перо.*

Шарль Перо нарадзіўся 12 студзеня 1628 года ў Парыжы. Быў малодшым сярод шасцярых дзяцей сям'і.

"Казкі" спрыялі дэмакратызацыі літаратуры і аказалі ўплыў на развіццё сусветнай казачнай традыцыі. На рускай мове казкі Перо ўпершыню выйшлі ў Маскве ў 1768 годзе пад назвай «Казкі пра чараўніц з маралямі». На беларускай мове – толькі ў 1970-ых гадах. Мяркуецца, што на цікавасць Перо да жанру казкі аказала ўплыў яго пляменніца. Найбольш вядомай з яе казак была «Спрытная прынцэса».


Слайд 3

Свае казкі Перо выдаў не пад уласным імем, а пад імем свайго дзевятнаццацігадовага сына, бо на той час Перо меў высокую адзнаку як пісьменнік, а казкі лічыліся «нізкім» жанрам, што магло падарваць рэпутацыю аўтара.

*За адказы вы зможаце атрымліваць жэтоны, якія дапамогуць вам павысіць адзнакі за ўрок.*

1) Якія са казак Шарля Перо вы ведаеце? Можаце называць па-руску, калі чыталі на рускай мове.

*(Запіс на дошчы: «Красная шапочка», «Золушка или хрустальная туфелька», «Рике с хохолком», «Кот в сапогах», «Мальчик с-пальчик», «Спящая красавица»).*



Слайд 4

2) Паспрабуем знайсці адпаведнікі беларускім назвам гэтых казак з дапамогай «воблака слоў», дзе ўсе словы будуць раскіданы, а нам трэба знайсці патрэбныя.

*("Кот у ботах", "Малое Пальчанё", "Папялушка ці Крышталёвы пантофлік", "Прыгажуня ў сонным лесе", "Чубаты Рыкэ", "Чырвоны Каптурок"; прычапіць на дошку).*



*Давайце звернімся да казкі «Папялушка ці Крышталёвы пантофлік».*

*Ахарактарызуем пры дапамозе назоўнікаў гэту дзяўчынку, якую сёстры празвалі Папялушкай. Назоўнікі адказваюць на якія пытанні?*

*(працавітасць, дабрыня, міласэрнасць, чуласць, пяшчота, шчырасць, бяскрыўднасць, нязлоснасць, клапатлівасць, нягрубасць, бяспомслівасць, прыгажосць)*

*Мы разам утварылі назоўнікі ад прыметнікаў: працавіты – працавітасць, чулы – чуласць, нягрубы – нягрубасць і інш. Што мы дабаўлялі? (суфіксы)*

1) *Як вы думаеце, пры дапамозе якіх марфем мы можам ўтвараць назоўнікі?*
2) *Ці толькі ад прыметнікаў утвараюцца назоўнікі? Могуць яны ўтварацца і ад іншых часцін мовы?*

**2. Пазнаваўча-аперацыйны этап**

Праверка дамашняга задання:

Франтальнае вуснае апытванне

*(за адказы вучні атрымліваюць жэтоны)*

1) Што абазначае назоўнік?
2) На якія пытанні адказвае назоўнік?
3) Па чым мяняецца назоўнік?
4) Колькі склонаў у беларускай мове?
5) Колькі скланенняў назоўнікаў?
6) Якія назоўнікі адносяцца да 1 скланення, 2 і 3?
7) Прывядзіце прыклады рознаскланяемых назоўнікаў?
8) Прывядзіце прыклады нескланяемых назоўнікаў?

Увядзенне новага матэрыялу:

Знаёмства з тэарэтычным матэрыялам падручніка

Стар.117

2. Слова настаўніка

Фарміраванне ўменняў па вывучаемай тэме, замацаванне матэрыялу, вывучанага на дадзеным уроку і раней пройдзенага, які з ім звязаны тэматычна:

1. Запаўненне таблічкі

Размяркуем прыведзеныя назоўнікі ў залежнасці ад спосабаў іх утварэння.

| ПРЫСТАВА-ЧНЫ | СУФІКСА-ЛЬНЫ | ПРЫСТАВАЧНА-СУФІКСАЛЬНЫ | СКЛАДАН-НЕ | БЯССУФІК-СНЫ | АБРЭВІЯ-ЦЫЯ |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

Чытачка, разумніца, няшчасце, праўнучка, прыпечак, настольнік, хлебапёк, далягляд, сінь, бег, БДУ, лясгас.

**Фізкультхвілінка**

1) *Калі называю назоўнікі – прысядаем, калі словы іншых часцін мовы – робім нахілы ў бакі.*

Дзяўчынка, прынц, пантофлі, працавітая, добрая, мачыха, танцаваць, баль, карэта, гарбуз, яны, бегла, спяшалася, дванаццаць, гадзіннік, поўнач.

2) Гімнастыка для вачэй. Заплюшчваем вочы, слухаем музыку, уяўляючы, што мы на балі танцуем, адпачываем.

Развіццё навыкаў і ўменняў. Абагульненне і сістэматызацыя ведаў, удасканаленне навыкаў і ўменняў з прыцягненнем абагульненых ведаў:

Работа каля дошкі.




Вызначце, ад якіх слоў утварыліся прыведзеныя назоўнікі, запішыце часціну мовы гэтых слоў і спосаб утварэння назаўнікаў, вызначце спосаб утварэння і часцінамоўную прыналежнасць слоў.

Слайд 5

Падарожжа па замку «Назоўнік»

*Я прапаноўваю вам прайсціся па замку, куды прыехала Папялушка на баль. Але на кожным кроку вам трэба будзе выконваць заданні. Кожны з вас атрымлівае маршрутны ліст, каб не заблукаць. Усе адказы на заданні вы будзеце запісваць у яго.*




## 3. Заключны этап

Падвядзенне вынікаў урока і рэфлексія:

Ацэнка вучэбнай дзейнасці школьнікаў. Падлічваем жэтоны, колькасць запісваем на лістах. Здаем на праверку.

1. Зварот да пытанняў:
   1) *Як вы думаеце, пры дапамозе чаго мы можам утвараць назоўнікі?*
   2) *Ці толькі ад прыметнікаў утвараюцца назоўнікі? Могуць яны ўтварацца і ад іншых часцін мовы?*
2. Слова настаўніка



Прыём «Смайлік настрою». *Калі Папялушка ўцякала ад прынца, бо гадзіннік прабіў дванаццаць, яна згубіла крышталёвы пантофлік. Потым прынц змог знайсці яе толькі па гэтым пантофліку. Хачу прапанаваць вам намаляваць на пантофліку той смайлік, які характарызуе ваш настрой на ўроку.*

Інфармацыя пра дамашняе заданне:

§ 39, практ. 237.